ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 34 (313) | Субота, 2 снежня 1978 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

**Завяршаецца другі этап Усесаюзнага Ленінскага заліку «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!» З 1 студзеня 1979 года пачынаецца яго трэці, завяршаючы этап. Камсамольскім арганізацыям факультэтаў ГДУ прадстаіць вялікая работа па складанню асабістых комплексных планаў «Вучымся камунізму, будуем камунізм!» кожным удзельнікам Ленінскага заліку.**

**З мэтай актывізацыі камсамольцаў, правільнага разумення імі такой складанай формы работы, як Ленінскі залік, з сённяшняга нумара нашай газеты мы пачынаем друкаваць тэматычны матэрыял.**

## І. ЛЕНІНСКІ ЗАЛІК У СІСТЭМЕ ІДЭЙНА-ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ

Ідэя Ленінскага заліку аб'ектыўна ўзнікла ў 60-х гадах на базе гістарычнага вопыту дзейнасці ВЛКСМ. Ён пачынае свае вытокі з так званай «самаправеркі ведаў камсамольцаў», якая атрымала сваё развіццё ў 30-я гады. Ленінскі залік, такім чынам, з'явіўся гістарычна пераемнай формай работы, у аснове якой ляжыць заканамернае імкненне членаў ВЛКСМ даць справаздачу аб выкананні ленінскага запавета «вучыцца камунізму». Аднак, набыўшы новае жыццё ў 60-я гады, залік не стаў простым паўторам форм работы камсамола ў мінулым. Ленінскі залік сёння, як форма камсамольскай работы, мае шэраг істотных асаблівасцей. Ленінскі залік з'яўляецца:

— арганізацыйнай і ідэалагічнай формай ажыццяўлення важнейшага прынцыпа дзейнасці камуністычных арганізацый: адзінства, непарыўнасці тэорыі і практыкі;

— комплекснай формай работы камсамола ў сістэме камуністычнага выхавання моладзі, якая дазваляе спалучыць фарміраванне марксісцка-ленінскага светапогляду, павышэнне грамадска-палітычнай і працоўнай актыўнасці камсамольца;

— формай работы, якая забяспечвае дыферэнцыраваны падыход у рабоце з кожным членам ВЛКСМ.

Ленінскі залік сёння — гібкая, дзейсная і жыццёвая форма работы камсамольскіх арганізацый, якая дазваляе дайсці да кожнага юнака і дзяўчыны.

Надаючы выключна важнае значэнне далейшаму узмацненню камуністычнага выхавання моладзі, мабілізацыі камсамольцаў, юнакоў і дзяўчат на актыўны ўдзел у ажыццяўленні гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС, планаў X пяцігодкі, Бюро ЦК ВЛКСМ прыняло пастанову (ад 2 чэрвеня 1976 года) аб правядзенні ў 1976 — 1980 гадах Усесаюзнага Ленінскага заліку «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!». У гэтай пастанове вызначаны галоўныя задачы, рашэнню якіх павінен садзейнічаць Ленінскі залік. Такімі задачамі з'яўляюцца:

— выхаванне моладзі ў духу камуністычнай ідэйнасці, беззапаветнага савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях партыі і народа, гатоўнасць аддаць свае сілы, а калі патрабуецца, і жыццё ў барацьбе за камунізм;

—барацьба за авалоданне вышынямі сучасных ведаў, навукі і тэхнікі, далейшы ўздым палітычнага і культурна-тэхнічнага ўзроўню моладзі, глыбокае і творчае вывучэнне марксісцка-ленінскай тэорыі, прац Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР тав. Л. І. Брэжнева, рашэнняў і матэрыялаў XXV з'езда КПСС, удасканальванне палітычнага, працоўнага і маральнага выхавання навучэнцаў і студэнтаў;

— актыўны ўдзел камсамольцаў, юнакоў і дзяўчат у барацьбе за камунізм, выкананне планаў X пяцігодкі, паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу. Выхаванне ў моладзі камуністычных адносін да працы, умення працаваць з агеньчыкам, ініцыятыўна, з поўнай аддачай сіл, без адстаючых, строгага захавання дысцыпліны, эканоміі і ашчаднасці;

— устанаўленне савецкага ладу жыцця, выхаванне ў моладзі высокіх маральна-палітычных якасцей, захаванне маральнага кодэксу будаўніка камунізму, рашучая барацьба з амаральнымі з'явамі. Камсамолец закліканы словам і справай, сваім асабістым прыкладам заўсёды і ва ўсім зацвярджаць нормы камуністычнай маралі;

— класавая загартоўка моладзі, выхаванне яе ў духу брацкай салідарнасці з народамі сацыялістычных краін, з усімі барацьбітамі супраць імперыялізму, фашызму і каланіялізму, за мір і сацыяльны прагрэс;

— далейшае арганізацыйна-палітычнае ўмацаванне пярвічных камсамольскіх арганізацый, павышэнне іх баявітасці, паляпшэнне індывідуальнай работы, уменне дайсці да кожнага камсамольца, дапамагчы ім павысіць свой ідэйны і прафесіянальны ўзровень, унесці максімальны асабісты ўклад у выкананне рашэнняў XXV з'езда КПСС.

Мэта Ленінскага заліку — далучэнне камсамольцаў і моладзі да паўсядзённага і глыбокага вывучэння спадчыны У. І. Леніна, важнейшых партыйных дакументаў, павышэнне працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці юнакоў і дзяўчат, прыцягненне кожнага камсамольца да шырокага ўдзелу ў жыцці сваёй арганізацыі, выхаване ідэйна-загартаваных, свядомых барацьбітоў за ідэалы Камуністычнай партыі, фарміраванне ва ўсіх камсамольцаў, юнакоў і дзяўчат актыўнай жыццёвай пазіцыі.

(Працяг на 2-й стар.).

## ПЛЕНУМ ЦК КПСС

**27 лістапада 1978 года адбыўся чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.**

**Пленум заслухаў даклады намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыні Дзяржплана СССР тав. М. К. Байбакова «Аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1979 год» і міністра фінансаў СССР тав. В. Ф. Гарбузава «Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1979 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1977 год».**

**На Пленуме з вялікай прамовай выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР тав. Л. І. Брэжнеў.**

**Пленум ЦК КПСС прыняў па абмеркаваных пытаннях адпаведную пастанову.**

**Пленум ЦК КПСС разгледзеў арганізацыйныя пытанні.**

**Пленум ЦК перавёў сакратара ЦК КПСС тав. Чарненку К. У. з кандыдатаў у члены Палітбюро ЦК КПСС.**

**Пленум ЦК выбраў кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС тав. Ціханава М. А.**

**Пленум ЦК выбраў кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС тав. Шэварднадзе Э. А.**

**Пленум ЦК выбраў тав. Гарбачова М. С. сакратаром ЦК КПСС.**

**Пленум ЦК выслабаніў тав. Мазурава К. Т. ад абавязкаў члена Палітбюро ЦК КПСС па стану здароўя і ў сувязі з яго просьбай.**

**На гэтым Пленум ЦК КПСС закончыў сваю работу.**

**(ТАСС).**

## СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

У Вялікім Крамлёўскім палацы 29 лістапада пачала работу дзесятая сесія Вярхоўнага Савета СССР дзевятага склікання. Сесіі папярэднічаў Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС. Пастанову Пленума аб праектах Дзяржаўнага плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР і Дзяржаўнага бюджэту СССР на 1979 год, выступленне на Пленуме таварыша Л. І. Брэжнева з вялікай цікавасцю і глыбокім задавальненнем сустрэлі ўсе савецкія людзі.

Выкладзеныя Л. І. Брэжневым вывады і ўстаноўкі цалкам і поўнасцю адобраны Пленумам. Вырашана пакласці іх у аснову дзейнасці ўсіх партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый, гаспадарчых органаў.

Пленум адобрыў у асноўным праекты Дзяржаўнага плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР і Дзяржаўнага бюджэту СССР на 1979 год. Савету Міністраў СССР даручана ўнесці гэтыя праекты на разгляд Вярхоўнага Савета СССР.

Сесія Вярхоўнага Савета СССР адкрылася ў 10 гадзін раніцы сумесным пасяджэннем Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей.

Бурнымі, працяглымі апладысментамі дэпутаты і госці сустрэлі таварышаў **Л. І. Брэжнева, Ю. У. Андропава, В. В. Грышына, А. А. Грамыку, А. П. Кірыленку, А. М. Касыгіна, Д. А. Кунаева, А. Я. Пельшэ, Р. В. Раманава, М. А. Суслава, Д. Ф. Усцінава, К. У. Чарненку, У. В. Шчарбіцкага, Г. А. Аліева, П. Н. Дземічава, В. В. Кузняцова, П. М. Машэрава, Б. М. Панамарова, Ш. Р. Рашыдава, М. С. Саломенцава, М. А. Ціханава, Э. А. Шэварднадзе, І. В. Капітонава, У. І. Далгіх, М. В. Зімяніна, Я. П. Рабава, К. В. Русакова, М. С. Гарбачова.**

Дэпутаты аднагалосна зацвердзілі парадак дня сесіі і арганізацыю яе работы.

На парадку дня сесіі пытанні:

1. Аб намесніках Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад Кіргізскай ССР і Эстонскай ССР.

Пытанне ўносіцца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР.

2. Аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1979 год і аб ходзе выканання Дзяржаўнага плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР у 1978 годзе.

Пытанне ўносіцца Саветам Міністраў СССР.

3. Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1979 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1977 год.

Пытанне ўносіцца Саветам Міністраў СССР.

4. Аб праекце Закона СССР аб грамадзянстве СССР.

Пытанне ўносіцца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР.

5. Аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Пытанне ўносіцца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР.

З дакладам «Аб Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1979 год і аб ходзе выканання Дзяржаўнага плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР у 1978 годзе» выступіў намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыня Дзяржплана СССР дэпутат **М. К. Байбакоў.**

Затым з дакладам «Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1979 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1977 год» выступіў міністр фінансаў СССР дэпутат **В. Ф. Гарбузаў.**

Пасля гэтага на пасяджэннях палат Вярхоўнага Савета СССР пачалося абмеркаванне заслуханых дакладаў. (ТАСС).

60 БССР КПБ

## КАФЕДРА—ЗНАМЯНАЛЬНАМУ ЮБІЛЕЮ

...сістэме мерапрыемстваў, ...ваных дэканатам і парт... нашага факультэта ў го... -годдзя БССР і Кампар... ларусі, важнае месца ад... такім відам работы, як ... лекцый для насельніцт... ...а і вобласці, сустрэчы ...мі вучонымі рэспублікі ... правядзенне выязных пасяджэнняў кафедр сумесна з настаўнікамі сельскіх і раённых школ і г. д.

Кафедра рускай літаратуры правяла выязныя пасяджэнні ў Лельчыцкім і Ельскім раёнах. На пасяджэнні ў лельчыцкай СШ № 1 загадчык кафедры рускай літаратуры М. В. Родчанка расказаў аб падрыхтоўцы кадраў для Палесся ў Гомельскім дзяржуніверсітэце, а дацэнт У. М. Сабаленка даў шырокую інфармацыю пра гісторыка-філалагічны факультэт, яго кафедры, аб навуковых сілах і напрамках, праводзімых навуковых даследаванняў, асаблівасцях вузаўскага вучэбна-выхаваўчага працэсу. В. а. дацэнта А. К. Няронская пазнаёміла філолагаў школы з сучаснымі патрабаваннямі да ўрокаў літаратуры і адпаведна з узрастаючымі патрабаваннямі па мове і літаратуры да паступаючых як на спецыяльны, так і на іншыя факультэты.

У той жа дзень названыя супрацоўнікі кафедры рускай літаратуры сустрэліся з вучнямі лельчыцкіх школ з мэтай іх арыентацыі для паступлення ў ГДУ.

Для працоўных г. п. Лельчыцы прачыталі лекцыі: У. М. Сабаленка — «Л. М. Талстой. Да 150-годдзя з дня нараджэння», М. В. Родчанка — «Праблемы сям'і і шлюбу ў сучаснай савецкай літаратуры», А. К. Няронская — «Савецкая літаратура аб барацьбе за захаванне і ўмацаванне міру».

Плённым было выязное пасяджэнне кафедры рускай літаратуры і ў Ельскім раёне, дзе, акрамя сустрэч з настаўнікамі і вучнямі, абмену думкамі па важнейшых педагагічных пытаннях, былі прачытаны лекцыі: М. В. Родчанкам — «60-годдзе БССР і Кампартыі Беларусі і перспектывы развіцця Гомельскага дзяржуніверсітэта», У. М. Сабаленкам — «Ленінскі прынцып партыйнасці літаратуры і крытыка сучаснага буржуазнага мастацтва», А. К. Няронскай — «XXV з'езд КПСС і праблемы развіцця сучаснай савецкай літаратуры».

**Т. ЯЗЭПАВА,**
**дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# ТЫХ ДЗЁН НЕ ЗМОЎКНЕ СЛАВА

*У ГОНАР 35-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ*



## РАСКАЗАЎ ГЕНЕРАЛ

Днямі ў актавай зале універсітэта адбылася сустрэча выкладчыкаў і студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта з генерал-маёрам Васілём Андрэевічам Канавалавым, прысвечаная 35-годдзю вызвалення Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. В. А. Канавалаў быў удзельнікам жорсткіх баёў за вызваленне нашага горада. Ён захапляюча і ўсхвалявана расказаў аб тых незабыўных днях, калі на подступах да Гомеля вяліся кровапралітныя баі, у якіх цуды гераізму праяўлялі салдаты і камандзіры Чырвонай Арміі.

Студэнты горача дзякавалі свайму дарагому госцю за цікавы расказ, уручылі Васілю Андрэевічу жывыя кветкі і сувеніры.

**А. НЯРОНСКАЯ,**
**в. а. дацэнта кафедры рускай літаратуры.**

**НА ЗДЫМКУ: генерал-маёр запасу В. А. Канавалаў на сустрэчы ва універсітэце.**

Фота **Б. Шкурко.**



**У студэнцкім парку, каля брацкай магілы воінам, загінуўшым у баях за Радзіму, адбыўся мітынг, прысвечаны 35-годдзю вызвалення Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**
**На ім выступілі падпалкоўнік запасу, выкладчык кафедры грамадзянскай абароны А. А. Баскакаў, загадчык кафедры эканомікі працы У. Д. Арэшчанка, якія былі ўдзельнікамі баёў за вызваленне нашай вобласці і горада ад ворагаў.**

Сектар ваенна-патрыятычнага выхавання камітэта камсамола універсітэта, які ўзначальвае студэнт гісторыка-філалагічнага факультэта Г. Стрыжак, у цесным кантакце з камітэтам ДТСААФ ГДУ праводзіць шмат цікавых мерапрыемстваў. Так, на ўсіх факультэтах прайшоў «Тыдзень славы герояў», у студэнцкіх групах наладжваюцца сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, воінамі Савецкай Арміі. У практыку ваенна-патрыятычнай работы камітэта ЛКСМБ трывала ўвайшлі мітынгі, вечары-сустрэчы.

## ПАРТЫЗАНСКІМІ СЦЕЖКАМІ

Важным напрамкам у гэтай рабоце з'яўляецца ўдзел студэнтаў ва Усесаюзным паходзе па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Стала добрай традыцыяй правядзенне ў яго рамках пахода студэнтаў-першакурснікаў да месца стаянкі і баёў партызанскага атрада «Бальшавік», які дзейнічаў у гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Гомельскай вобласці.

У мінулую нядзелю студэнты біялагічнага, гісторыка-філалагічнага факультэтаў, факультэта фізічнага выхавання зрабілі турпаход у Клёнкі, дзе перад імі выступіў ветэран Вялікай Айчыннай вайны, выкладчык кафедры грамадзянскай абароны ГДУ Г. С. Мільчанка.

Будзе аб чым успомніць і першакурснікам матэматычнага, фізічнага і эканамічнага факультэтаў, наведаўшым месца першай стаянкі былога партызанскага атрада «Бальшавік» — «Крынічку». Рабяты агледзелі зямлянкі, якія ў суровыя першыя месяцы акупацыі далі прытулак народным мсціўцам, месца, дзе адбыўся першы бой партызан з ворагамі. Затым адбыўся мітынг. Перад студэнтамі выступіў былы начальнік асобага аддзела партызанскай брыгады «Бальшавік» Філарэт Філімонавіч Кічко. Ён расказаў аб слаўнай баявой біяграфіі атрада, аб усенароднай падтрымцы партызанскага руху ў Беларусі.

**С. БАДРУНОЎ.**

## II. ЗМЕСТ І СТРУКТУРА ЛЕНІНСКАГА ЗАЛІКУ

**(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).**

Асобныя кампаненты і элементы сучаснай структуры Ленінскага заліку практыкаваліся ў камсамольскай рабоце як самастойныя мерапрыемствы задоўга да ўзнікнення Ленінскага заліку. Інакш кажучы, тыя элементы, якія з'яўляюцца цяпер структурнымі звеннямі Ленінскага заліку, з'явіліся не выпадкова, а на пэўных этапах камуністычнага будаўніцтва як адлюстраванне аб'ектыўнага працэсу развіцця ўсяго камсамольскага жыцця. Ленінскі залік, які абагуліў розныя формы камуністычнага выхавання моладзі, стаў новай з'явай у камсамольскім жыцці, шматгранным па сваёй накіраванасці, складаным па арганізацыйнай структуры, комплексным па характару рашэння задач і ўздзеянню на работу камсамольскіх арганізацый у цэлым і на кожнага члена ВЛКСМ асобна.

Што разумеецца пад зместам Ленінскага заліку? Гэта асноўныя напрамкі дзейнасці камсамольскіх арганізацый, звязаныя з ажыццяўленнем ленінскага запавета моладзі «вучыцца камунізму», канкрэтызаванага партыяй у дастасаванні да сучасных умоў. Адсюль выцякаюць патрабаванні, якія прад'яўляюцца да ўдзельнікаў заліку:

— нястомна авалодваць тэорыяй марксізму-ленінізму, вывучаць творчую ленінскую спадчыну, дакументы партыі;

— актыўна, творча ўдзельнічаць у працоўнай і грамадскай дзейнасці свайго калектыву;

— пастаянна павышаць свой агульнаадукацыйны, прафесіянальны, культурна-эстэтычны ўзровень, удасканальваць фізічную падрыхтоўку.

Гэтыя патрабаванні адлюстроўваюць адзін з асноўных прынцыпаў ідэалагічнай работы камсамола — аб непарыўным адзінстве тэарэтычнага засваення камунізму з практычным удзелам у яго стварэнні. Асаблівасць Ленінскага заліку заключаецца ў тым, што ён стварае рэальныя магчымасці для ажыццяўлення гэтага прынцыпу ў дзейнасці пярвічнай камсамольскай арганізацыі і кожнага з яе членаў. Гэтыя магчымасці закладзены ў структуры Ленінскага заліку, якая ўключае ў сябе наступныя элементы:

1. Складанне асабістых комплексных планаў «Вучымся камунізму, будуем камунізм!». У іх павінны ўлічвацца імкненні і патрэбы канкрэтнага чалавека і магчымасці калектыву. Для такіх планаў характэрны тры асаблівасці: комплекснасць, перспектыўнасць, дыферэнцыраванасць. Пры складанні планаў неабходна дапамога калектыву, што павінна дасягацца парадай актыву або спецыяльна створанай камісіі.

2. Комплекснае перспектыўнае планаванне работы камсамольскіх арганізацый, якое з'яўляецца часткай комплекснага плана ідэйна-выхаваўчай работы. У ім павінны быць вызначаны мэты і задачы калектыву ў цэлым, зведзены ў адзінае цэлае і створаны магчымасці для выканання асабістых комплексных планаў. Комплекснае планаванне заклікана аб'яднаць і каардынаваць намаганні ўсіх арганізацый, якія займаюцца выхаваннем маладога пакалення.

3. Грамадска-палітычная атэстацыя членаў ВЛКСМ. Гэта форма кантролю з боку камсамольскай арганізацыі і самакантролю за практычным ажыццяўленнем кожным камсамольцам складзеных і зацверджаных асабістых комплексных планаў. Атэстацыя павышае ўзаемную адказнасць калектыву і асобы. Яна дапамагае ажыццяўляць пастаянны кантроль не толькі з боку калектыву ў адносінах да кожнай асобы, але і з боку кожнага камсамольца за дзейнасцю камсамольскай арганізацыі і яе важакоў; павышае прынцыповасць, патрабавальнасць да сябе і да таварышаў.

4. Ленінскія ўрокі сталі неаддымнай часткай Ленінскага заліку, якая садзейнічае актыўнай прапагандзе ленінізму сярод моладзі. У структуры заліку Ленінскаму ўроку належыць асаблівая роля: ён з'яўляецца не толькі актыўнай формай масавага авалодання ленінскай спадчынай, але і формай асэнсавання зместу іншых элементаў заліку, сродкам іх актывізацыі, спецыфічнай формай кантролю і самакантролю за практычным ажыццяўленнем ленінскага запавета «вучыцца камунізму».

У такім змесце і такой структуры Ленінскага заліку камсамольскія арганізацыі павінны бачыць метад далейшай актывізацыі кожнага камсамольца ў грамадска-палітычным і працоўным жыцці.



**Значнае месца ў вучэбным працэсе на фізічным факультэце адводзіцца практычным заняткам студэнтаў у шматлікіх лабараторыях.**
**НА ЗДЫМКУ: студэнт групы Ф-31 Міхаіл Казлоў на лабараторных занятках па радыёэлектроніцы.**

Фота **Б. Шкурко.**

## III. БАЯВАЯ ПРАГРАМА КАМСАМОЛА

Усесаюзны Ленінскі залік «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!» з'яўляецца баявой праграмай для ўсёй ідэалагічнай і арганізацыйнай работы камсамольскіх арганізацый на ўсе пяць гадоў дзесятай пяцігодкі.

У адпаведнасці з пастановай Бюро ЦК ВЛКСМ, Ленінскі залік «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!» праходзіць у тры этапы.

Першы з іх, які працягваўся да 31 снежня 1977 года, прысвячаўся 60-годдзю Вялікага Кастрычніка.

31 снежня 1978 года завяршаецца другі этап Усесаюзнага Ленінскага заліку. Ён прысвечаны 60-годдзю Ленінскага камсамола — выдатнай даце ў гісторыі нашага саюза.

На даным этапе першарадная ўвага ўдзяляецца далейшаму ўдасканаленню марксісцка-ленінскай вучобы камсамольцаў і моладзі. У камсамольскіх арганізацыях разгарнулася глыбокае вывучэнне ленінскіх запаветаў, дакументаў КПСС, гераічнай гісторыі Ленінскага камсамола.

Кожны юнак, кожная дзяўчына, якія носяць ля сэрца камсамольскі білет, павінны разумець і ганарыцца тым, што разам з М. Астроўскім, З. Касмадзям'янскай, А. Матросавым і Ю. Гагарыным, маладагвардзейцамі, пакарыцелямі цаліны, будаўнікамі БАМа, маладымі разведчыкамі нетраў Цюмені належаць да Ленінскага камсамола, што з'яўляюцца памочнікамі, байцамі вялікай арміі камуністаў.

З 1 студзеня 1979 года пачынаецца трэці, завяршаючы этап Усесаюзнага Ленінскага заліку. Ён прысвячаецца 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і будзе працягвацца да 31 снежня 1980 года.

У ходзе гэтага этапа неабходна шырока разгарнуць вывучэнне камсамольцамі і моладдзю жыцця і рэвалюцыйнай дзейнасці У. І. Леніна, яго геніяльных прац, прамовы на III з'ездзе камсамола, дакументаў КПСС. У камсамольскіх арганізацыях рэкамендуецца правесці Ленінскія чытанні «Справа Леніна жыве і перамагае», арганізаваць сустрэчы моладзі з ветэранамі партыі і камсамола, героямі войн і працы, маладымі гвардзейцамі пяцігодкі, забяспечыць актыўны ўдзел камсамольцаў ва Усесаюзным паходзе па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы партыі і народа.

Неабходна яшчэ шырэй разгарнуць баявое сацыялістычнае спаборніцтва моладзі за паспяховае завяршэнне X пяцігодкі.

У Ленінскім заліку — нашай баявой праграме дзеяння — расстаўлены буйныя вяхі. Абавязак камсамольскіх арганізацый, справа гонару кожнага камсамольца — азнаменаваць гэтыя слаўныя даты ў гісторыі КПСС, савецкага народа, Ленінскага камсамола ўдарнай, самаадданай працай, выдатнай вучобай, высокімі дасягненнямі ў ажыццяўленні рашэнняў XXV з'езда КПСС.

**(Заканчэнне чытайце ў наступным нумары газеты).**



# ПРЫРОДА І ТЫ

**СТАРОНКА ВЫПУСКАЕЦЦА ДРУЖЫНАЙ ПА АХОВЕ ПРЫРОДЫ БІЯЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА.**

*ВЫПУСК № 9*

## НА ЎСЕСАЮЗНЫМ СЕМІНАРЫ

Нядаўна ў г. Свярдлоўску праходзіў чарговы семінар студэнцкіх Дружын па ахове прыроды. На ім былі прадстаўлены 33 Дружыны з 26 гарадоў нашай краіны. У рабоце семінара прынялі ўдзел і тры члены Дружыны па ахове прыроды нашага універсітэта.

Семінар прысвячаўся праблеме аховы рэкрэацыйных тэрыторый, г. зн. прыродных зон, якія пастаянна выкарыстоўваюцца турысатамі для адпачынку.

Удзельнікі семінара заслухалі паведамленне Дружыны УрДУ аб стварэнні на Урале Сярэдне-Уральскага нацыянальнага парку.

У нацыянальным парку адпачынак людзей будзе спалучацца з шырокімі мерамі па ахове прыроды. Уваход сюды платны, а сродкі выкарыстаюць на работу па ахове асяроддзя. У такіх парках можна рэгуляваць прыток адпачываючых, ствараць спецыяльную сетку дарожак, засяваць найбольш наведваемыя ўчасткі травянымі культурамі, устойлівымі да вытоптвання.

Прыроднае абгрунтаванне праекта Сярэдне-Уральскага парку было зроблена членамі Дружын Уральскага дзяржаўнага універсітэта і МДУ. Удзельнікі семінара мелі магчымасць азнаёміцца з некаторымі славутасцямі будучага парку.

Праграма семінара прадугледжвала таксама абмен вопытам па асноўных напрамках дзейнасці Дружын. Тут была вызначана праграма «Ёлка», падводзіліся першыя вынікі і распрацоўвалася далейшая работа па праграме «Фауна», былі больш канкрэтызаваны задачы праграмы «Факт». На тэрыторыі будучага парку прайшлі вучэнні па праграме «Выстрал».

На адным з апошніх пасяджэнняў семінара прысутнічаў прадстаўнік ЦК ВЛКСМ. У сваім выступленні ён адобрыў дзейнасць Дружын, выказаў свае заўвагі і прапановы па іх далейшай рабоце.

Шмат карыснага ў справе аховы прыроды ўзялі для сябе на семінары члены Дружыны нашага універсітэта. Як кіраўніцтва да дзеяння ўспрынялі яны зацверджаныя ў г. Свярдлоўску праграмы «Ёлка» і «Фауна», якія змешчаны на гэтай старонцы.

**Л. ЦЯСЛЮК,**
**камандзір Дружыны па ахове прыроды, удзельніца семінара.**

ЯНЫ ПАВІННЫ ЖЫЦЬ

## БЕЛЫ ЖУРАВЕЛЬ

Многія з вас, канешне, чулі пра вялікую і прыгожую птушку — белага жураўля. Але мала хто аб ім можа што-небудзь расказаць, а тым больш пахваліцца, што бачыў яго. Ва ўяўленні некаторых людзей белы журавель нават не рэальнасць, а нешта міфічнае.

Што ж садзейнічае стварэнню такога арэола вакол яго? У першую чаргу, прыгажосць і зграбнасць белага жураўля. Па-другое, яго рэдкасць і нязначныя звесткі аб ім. Арэол таямнічасці вакол яго пачаў рассейвацца толькі ў апошні час.

Звесткі аб існаванні белага жураўля распаўсюдзіліся яшчэ ў мінулым стагоддзі з Казахстана і Паўночнага Прыкаспія, дзе мясцовыя жыхары, вандравальнікі-арнітолагі, назіралі вясной і восенню пралёт гэтых птушак на месца гнездавання і зноў на зімоўку. Тут, у стэпах з масай азёраў і балот, не ўзараных і не асушаных у той час, сустракалі ліняючых птушак.

Многія сцвярджаюць, што бачылі нават пары жураўлёў, якія будавалі сабе гнёзды, але рэальных доказаў гэтага — гнёздаў, яек або птушанят — не было знойдзена. І толькі пазней высветлілася, што гняздуюцца жураўлі на поўначы — у тундры, лесатундры, тайзе.

Белы журавель жыве ў нізоўях Обі і ў раёне паміж рэкамі Янай і Алазеяй на Поўначы. Але і тут мала каму пашчасціла ўбачыць гняздо белага жураўля. Вялікая белая птушка вельмі выразна выдзяляецца на жоўтым або зялёным фоне тундры. Яркае белае апярэнне кампенсуецца яе асцярожнасцю і выдатным зрокам. Чалавека, які ідзе па тундры, белы журавель прыкмячае за 2—2,5 кіламетры і ўзлятае, не падпускаючы яго да сябе бліжэй, чым на кіламетр. Гнёзды ж яны віюць у знач на забалочаных нізінах, каля невялікіх азяркоў, куды не часта заходзіць чалавек. Ды і само гняздо больш падобна на купіну, якая выступае з вады, а два буйныя яйкі, якія ляжаць у гняздзе, маюць плямістую маскіровачную афарбоўку.

Белы журавель гняздзіцца толькі ў нас, у Савецкім Саюзе. Гэта наша багацце. І тым крыўдней, што белых жураўлёў становіцца цяпер усё менш і менш. Белы журавель занесены ў міжнародную «Чырвоную кнігу» і павінен усямерна ахоўвацца. Скарачэнне яго колькасці звязана, з аднаго боку, з браканьерствам, з другога — са скарачэннем тэрыторый, дзе ён можа спакойна гнездавацца, не баючыся чалавека. Таму адзіным мерапрыемствам, якое можа захаваць гэту птушку, можа быць стварэнне шырокага запаведніка ў месцах яе гнездавання.

**С. ДУБКОЎ,**
**студэнт 3-га курса біялагічнага факультэта.**

## ПРАГРАМА «ЁЛКА»

Гэта ўжо старая і добрая традыцыя — сустракаць Новы год з упрыгожанай ёлкай. Мільёны людзей за некалькі дзён да гэтага свята імкнуцца набыць ёлку. Яны могуць зрабіць гэта трыма спосабамі: купіць яе праз сістэму дзяржаўнага гандлю (на ёлачным базары, у лясгасе, на прадпрыемствах, дзе яны працуюць), купіць у спекулянта, ссекчы ёлку самім. У двух апошніх выпадках грамадзяне ўступаюць у канфлікт з заканадаўствам, якое ахоўвае лясы ад самавольных парубак.

Большасць студэнцкіх Дружын па ахове прыроды з першых жа гадоў свайго існавання ўдзельнічаюць у барацьбе з масавымі незаконнымі парубкамі ёлак у пераднавагодні перыяд. Наладжваюцца дзяжурствы на чыгуначных вакзалах і станцыях, арганізуецца патруляванне лясных масіваў, ахова зялёных зон гарадоў, паркаў. Але як паказвае вопыт дзейнасці шэрагу Дружын, аператыўная работа па барацьбе з незаконнымі парубкамі ёлак не можа да канца вырашыць ёлачную праблему. Вялікія затраты на арганізацыю заслону на шляху парубшчыкаў і спекулянтаў прыводзяць да выяўлення толькі часткі парушэнняў.

Прынятая Дружынамі праграма «Ёлка» ставіць мэтай павысіць эфектыўнасць работы студэнцкіх Дружын і садзейнічаць у канчатковым выніку поўнаму вырашэнню ёлачных праблем.

Праграма падзелена на пяць раздзелаў.

Выкананне першага раздзела прадугледжвае збор і сістэматызацыю любой даступнай інфармацыі (даныя дзяржаўных арганізацый па планаванню і аб'ёму нарыхтовак ёлак, прыклады арганізацый гандлю ёлкамі, даныя аб размаху ёлачнага «браканьерства» і г. д.).

У другі раздзел праграмы ўваходзіць вядзенне аператыўнай работы па папярэджванню незаконных парубак. Правільна арганізаваная дзейнасць можа значна знізіць незаконныя парубкі, будзе служыць заслонай на шляху браканьерства.

Асноўная задача трэцяга раздзела — правядзенне анкеціравання насельніцтва з мэтай выяўлення размераў патрэб у ёлках і крыніцах іх задавальнення.

Выкананне чацвёртага раздзела прадугледжвае работу ў двух напрамках. З аднаго боку — гэта меры па прапагандысцкаму ўплыву на насельніцтва з мэтай папярэджвання незаконных парубак ёлак і спекуляцыі імі, з другога — прапагандысцкі ўплыў на насельніцтва з мэтай зніжэння патрэб гараджан у навагодніх ёлках (арганізацыя выставак навагодніх кампазіцый, прапаганда букетаў з яловых галінак).

Пяты раздзел уключае практычную рэалізацыю вынікаў, атрыманых у час работы па папярэдніх раздзелах праграмы, на аснове якіх складаюцца рэкамендацыі арганізацыям, якія нарыхтоўваюць і гандлююць ёлкамі.

## ПРАГРАМА «ФАУНА»

Захаванне генафонда планеты — неадкладная задача сучаснасці. Даказана неабходнасць зберажэння ўсіх відаў жывёлін, у тым ліку і тых, якія раней лічыліся нават шкоднымі для чалавека. Кожны біялагічны від— унікальнае стварэнне прыроды і страта яго не ўзнаўляецца. Між тым, па даных Міжнароднага саюза аховы прыроды і прыродных рэсурсаў, з 1600 года на Зямлі знікла 36 відаў млекакормячых і 94 віды птушак. Цяпер пад пагрозай знікнення знаходзіцца прыкладна кожны васемнаццаты від млекакормячых і кожны трыццаты від птушак.

Для прыцягнення ўвагі сусветнай грамадскасці да дрэннага становішча многіх відаў жывёлін у ліпені 1966 года Камісіяй па рэдкіх відах Міжнароднага саюза аховы прыроды і прыродных рэсурсаў была выдадзена «Чырвоная кніга фактаў», якая ўтрымлівае пералік і апісанне відаў жывёлін і раслін, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

Дзейсную ахову рэдкіх відаў можна наладзіць толькі на навуковай аснове. Неабходна ведаць межы арэала віда, дынаміку яго колькасці, структуру папуляцыі і многія іншыя аспекты яго экалогіі. Між тым, экалогія большасці рэдкіх відаў фауны СССР вывучана яшчэ вельмі слаба — у тым ліку і відаў, уключаных у «Чырвоную кнігу СССР».

Праграма «Фауна» ставіць сваёй мэтай сіламі членаў Дружын па ахове прыроды і іншых маладзёжных прыродаахоўных арганізацый, а таксама маладых спецыялістаў-заолагаў, інтэнсіфікаваць вывучэнне відавога саставу, распаўсюджвання, колькасці і экалогіі рэдкіх відаў жывёлін, а таксама ўсямерна садзейнічаць ахове гэтых відаў на месцах. Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць відам жывёлін, уключаных у «Чырвоную кнігу СССР».

Праграма складаецца з 5 узаемазвязаных раздзелаў. Першы — уключае стварэнне агульнасаюзнай картатэкі навуковых работ па рэдкіх відах фауны СССР. Раздзел другі. Падрыхтоўка праектаў рашэнняў выканкомаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў па ахове жывёльнага свету.

Раздзел трэці. Фауністычныя даследаванні на тэрыторыі вобласці, краю, рэспублікі. Мэта данага раздзела праграмы — вывучэнне сіламі маладзёжных прыродаахоўных арганізацый відавога саставу і распаўсюджвання жывёлін, уключаных у «Чырвоную кнігу СССР», на тэрыторыі сваіх абласцей.

Раздзел чацвёрты. Вывучэнне экалогіі і паводзін асобных рэдкіх відаў фауны СССР.

Раздзел пяты. Шматгадовы кантроль за колькасцю рэдкіх відаў.

**ЗДАРЭННЕ**

## СУТЫЧКА З БРАКАНЬЕРАМІ

19 лістапада наша група ў саставе 14 чалавек пад кіраўніцтвам студэнта 3-га курса геалагічнага факультэта Аляксандра Котава выехала з заданнем у Бабічскае лясніцтва. Па прыбыццю на месца, падзяліліся на дзве групы. Адна з іх накіравалася на інспекціраванне ў лес, другая — да ракі. Сустрэўшыся на чыгуначнай станцыі, мы даведаліся, што другая група канфіскавала брэдзень даўжынёй 25 м. Быў складзены акт, запісаны прозвішчы браканьераў, нумары іх матацыклаў.

Пры пасадцы на поезд утварылася стоўпатварэнне. Нашы рабяты вымушаны былі сесці ў розныя вагоны. Ад'ехаўшы за станцыю Дземяхі, мы заўважылі Аляксандра Котава моцна ўсхваляваным. З абрыўкаў яго мовы мы зразумелі, што браканьеры, у якіх быў канфіскаваны брэдзень, селі ў поезд разам з намі і напалі на нашых рабят. У тамбуры яны нанеслі Пятру Марчанку цяжкае ножавое раненне і здолелі ўцячы.

На станцыі Рэчыца, дзякуючы ўмелым і своечасовым дзеянням членаў дружыны Ю. Дуброўскага, К. Казлова, С. Садоўскага, А. Котава, С. Паўлоўскага, А. Масквічова, Ю. Яршова-Мазурава, Ю. Траццякова, В. Максімава, С. Мінеева і іншых была выклікана машына «хуткай медыцынскай дапамогі» і пацярпеўшы дастаўлены ў гарадскую бальніцу. Тут яму неадкладна зрабілі аперацыю, якая працягвалася некалькі гадзін. Аднак становішча Пятра заставалася небяспечным. Спатрэбілася кроў. Студэнты універсітэта 21 лістапада добраахвотна паехалі ў Рэчыцкую бальніцу, каб даць частку сваёй крыві для выратавання таварыша па вучобе.

Мы спадзяемся, што з цягам часу Пётр Марчанка выздаравее, а браканьеры, якія замахнуліся на жыццё дружынніка і на якіх ужо заведзена крымінальная справа, панясуць заслужанае суровае пакаранне.

**Студэнты 1-га курса геалагічнага факультэта, члены Дружыны.**

## УДЗЯЧНЫ

**Калектыў студэнтаў і выкладчыкаў біялагічнага факультэта выказвае шчырую ўдзячнасць усім студэнтам універсітэта, якія добраахвотна далі сваю кроў для нашага студэнта Пятра Марчанкі, цяжка пацярпеўшага ад рукі браканьера ў рэйдзе Дружыны па ахове прыроды.**

# ПАЛАЖЭННЕ АБ АГЛЯДЗЕ-КОНКУРСЕ НА ЛЕПШУЮ АКАДЭМІЧНУЮ ГРУПУ ГДУ

Агляд-конкурс ставіць сваёй мэтай павышэнне ўзроўню ведаў, прыцягненне ўсіх студэнтаў да актыўнага ўдзелу ў навукова-даследчай і грамадска-палітычнай рабоце, умацаванне працоўнай дысцыпліны, стварэнне абстаноўкі ўзаемадапамогі і творчай актыўнасці ў кожным студэнцкім калектыве, садзейнічае паляпшэнню падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў — людзей высокай культуры, шырокай эрудыцыі, сапраўдных грамадзян сацыялістычнага грамадства.

### УМОВЫ І ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ

Лепшая акадэмічная група Гомельскага дзяржаўнага універсітэта вызначаецца па наступных паказчыках:

1. Колькасць студэнтаў у пачатку семестра.

2. Колькасць студэнтаў у канцы семестра (перад сесіяй).

3. Колькасць студэнтаў, выключаных з універсітэта за непаспяховасць і парушэнне дысцыпліны.

4. Абсалютная паспяховасць.

5. Сярэдні бал у групе.

6. Колькасць студэнтаў, якія здалі сесію:

а) толькі на «выдатна»,

б) на «добра» і «выдатна».

7. Абсалютная паспяховасць па грамадскіх навуках

8. Колькасць студэнтаў, якія здалі экзамены па грамадскіх навуках:

а) толькі на «выдатна»,

б) на «добра» і «выдатна».

9. Удзел студэнтаў у навуковай рабоце (указаць колькасць студэнтаў группы, ахопленых навукова-даследчай работай).

10. Колькасць навуковых работ, прадстаўленых у справаздачным годзе на:

а) універсітэцкіх выстаўках, аглядах, конкурсах, канферэнцыях, у тым ліку адзначаных граматамі, дыпломамі.

б) рэспубліканскіх выстаўках, аглядах, конкурсах, канферэнцыях, у тым ліку адзначаных медалямі, граматамі, дыпломамі.

в) усесаюзных выстаўках, аглядах, конкурсах, канферэнцыях, у тым ліку адзначаных медалямі, граматамі, дыпломамі.

11. Колькасць студэнтаў, якія ўдзельнічаюць у гаспдагаворнай рабоце і распрацоўцы дзяржбюджэтных тэм.

12. Удзел студэнтаў у конкурсе работ па грамадскіх навуках (указаць колькасць студэнтаў групы, якія прымаюць удзел у конкурсе работ па грамадскіх навуках).

13. Колькасць работ, прадстаўленых у справаздачным годзе на:

а) універсітэцкі конкурс, у тым ліку адзначаных дыпломамі, граматамі,

б) рэспубліканскі конкурс, у тым ліку адзначаных дыпломамі, граматамі,

в) усесаюзны конкурс, у тым ліку адзначаных дыпломамі, граматамі.

14. Вынікі атэстацыі па грамадска-палітычнай практыцы студэнтаў (лічбавы паказчык вызначаецца адносінамі колькасці атэставаных студэнтаў да колькасці студэнтаў групы).

15. Вынікі ўдзелу студэнтаў у грамадскім жыцці (лічбавы паказчык вызначаецца адносінамі колькасці студэнтаў групы, якія маюць пастаянныя грамадскія даручэнні, да колькасці студэнтаў групы).

16. Вынікі ўдзелу студэнтаў у трэцім, працоўным семестры (указаць колькасць студэнтаў, якія прынялі ўдзел у руху СБА).

17. Вынікі ўдзелу студэнтаў у спартыўным жыцці. Колькасць студэнтаў:

а) здаўшых нормы ГПА за бягучы семестр, у тым ліку на «Залаты значок ГПА»;

б) упершыню атрымаўшых або павысіўшых свае спартыўныя разрады за справаздачны перыяд;

в) заняўшых у справаздачным годзе прызавыя месцы на:

— універсітэцкіх

— рэспубліканскіх

— усесаюзных

— міжнародных спаборніцтвах.

18. Узровень дысцыпліны (лічбавыя паказчыкі вызначаюцца):

а) адносінамі колькасці дапушчаных парушэнняў дысцыпліны студэнтамі груп да колькасці студэнтаў групы;

б) колькасцю пропускаў без уважлівых прычын на 1 студэнта групы;

в) колькасцю студэнтаў, якія атрымалі падзяку рэктара, дэкана.

### ТЭРМІНЫ ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ І МЕРЫ ЗААХВОЧВАННЯ

Агляд-конкурс на лепшую акадэмічную групу праводзіцца ў два этапы. Першы — прысвячаецца 60-годдзю ўтварэння БССР і КПБ. Пераможца I этапа агляду-конкурсу вызначаецца па выніках першага семестра па стану на пачатак другога семестра.

Другі этап прысвячаецца 10-годдзю ўтварэння Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Яго пераможца вызначаецца па выніках другога семестра па стану на пачатак новага навучальнага года і ўдзелу ў руху СБА.

Камсамольскім бюро факультэтаў прадставіць вынікі агляду-конкурсу на лепшую акадэмічную групу ў камітэт камсамола ГДУ.

I этап — да 20 лютага 1979 года.

II этап — да 10 верасня 1979 года.

Пераможцамі агляду-конкурсу лічацца акадэмічныя групы, якія маюць найбольш высокія паказчыкі па двух этапах.

Пераможцы ўзнагароджваюцца па I этапу:

за 1-е месца — пераходным вымпелам, граматай рэктарата, парткома, камітэта камсамола, прафкома.

за 2-е і 3-е месцы — граматай рэктарата, парткома, камітэта камсамола, прафкома.
Па II этапу: за 1-е месца — грашовая прэмія ў памеры 150 рублёў, за 2-е — 100 рублёў, за 3-е — 50 рублёў.

**Заўвага.** Даныя, якія падаюцца факультэтамі, павінны быць завераны дэканамі факультэтаў, сакратарамі партбюро, камсамольскіх арганізацый, старшынямі прафсаюзных бюро факультэтаў.

З мэтай кантролю і забеспячэння аб'ектыўнасці пры выпрацоўцы рашэння аб вызначэнні пераможцаў агляду-конкурсу вучэбна-выхаваўчыя камісіі факультэтаў могуць правяраць справаздачы акадэмічных груп. Да праверкі могуць таксама прыцягвацца групы, якія прэтэндуюць на прызавыя месцы.

Абсалютная паспяховасць вызначаецца адносінамі колькасці студэнтаў, здаўшых сесію, да агульнай колькасці студэнтаў групы.

Актыўнымі ўдзельнікамі ў навуковай рабоце лічацца тыя студэнты, якія выконваюць канкрэтнае заданне па гаспдагаворнай тэматыцы кафедр, распрацоўваюць дзяржбюджэтныя тэмы, выконваюць курсавыя і дыпломныя работы, рэгулярна ўдзельнічаюць у рабоце навуковых гурткоў, у падрыхтоўцы і правядзенні навуковых алімпіяд, конкурсаў.

Парушэнні дысцыпліны лічацца па колькасці паведамленняў РАУС, дэканатаў, студсаветаў.

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА, ПРАФКОМ.**

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных гутарак і інфармацый сярод студэнтаў у снежні 1978 года.

### I. ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

1. **Бачыць галоўнае, дабівацца большага!** (Аб канцэнтрацыі творчых сіл савецкіх людзей на ключавых праблемах народнай гаспадаркі, пастаўленых XXV з'ездам КПСС).

2. **Контуры чацвёртага года пяцігодкі.** (Аб мабілізацыі ўсіх рэсурсаў, рэзерваў, магчымасцей на паспяховае ажыццяўленне задач, вызначаных дзесятай сесіяй Вярхоўнага Савета СССР і адзінаццатай сесіяй Вярхоўнага Савета БССР дзевятага склікання).

Матэрыялы публікуюць усе газеты.

3. **У сузор'і роўных.** (Аб росквіце эканомікі і культуры Беларусі ў брацкай сям'і народаў СССР за 60 гадоў Савецкай улады).

Матэрыял публікуе газета «Советская Белоруссия».

4. **Юбілею рэспублікі — нашы працоўныя падарункі.** (Аб выкананні калектыўных і індывідуальных сацыялістычных абавязацельстваў, прынятых у гонар 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

### II. ПЫТАННІ ЭКАНАМІЧНАГА ЖЫЦЦЯ

5. **Павышаць якасць працы кожнага.** (Аб удзеле працоўных у барацьбе за павелічэнне выпуску прадукцыі вышэйшай катэгорыі якасці).

Матэрыялы публікуе газета «Советская Белоруссия».

### III. ПЫТАННІ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

6. **Справы свае звярай па Ільічу.** (Аб выхаванні ў кожнага савецкага чалавека патрэбнасці жыць і працаваць па запаветах У. І. Леніна).

Матэрыял публікуе газета «Знамя юности».

7. **Гонар і годнасць савецкага чалавека.**

Матэрыял публікуе газета «Чырвоная змена».

### IV. ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ

**Гутаркі аб Дэкларацыі дзяржаў — удзельніц Варшаўскага Дагавора.**

8. **За ўмацаванне бяспекі і супрацоўніцтва краін Еўропы.**

9. **Імперыялізм — галоўны віноўнік гонкі ўзбраенняў.**

Матэрыялы публікуе газета «Звязда».

# ДЗЕЛЯ МІРУ НА ЗЯМЛІ

Савецкі Фонд міру з'яўляецца арганізацыяй, створанай па ініцыятыве савецкай грамадскасці на добраахвотных пачатках. Ён зацверджан 27 красавіка 1961 года. Членамі-заснавальнікамі Фонду міру з'яўляюцца: савецкі Камітэт абароны міру, Саюз савецкіх таварыстваў дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, Савецкі камітэт салідарнасці краін Азіі і Афрыкі, Камітэт савецкіх жанчын, Савецкі пагуошскі камітэт вучоных, Камітэт маладзёжных арганізацый СССР, Савецкі камітэт ветэранаў вайны, Асацыяцыя садзейнічання ААН у СССР, Таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца, Цэнтрасаюз.

22 сакавіка гэтага года Усесаюзнай канферэнцыяй савецкага Фонду міру прыняты яго Статут.

Савецкі Фонд міру заклікаы аказваць фінансавую дапамогу народам, якія змагаюцца за свабоду, нацыянальную незалежнасць і сацыяльны прагрэс, падтрымлівае ўсіх, хто ставіць сваёй мэтай садзейнічаць захаванню і ўмацаванню міру на зямлі, усеагульнаму і поўнаму раззбраенню, развіваць дружбу, узаемаразуменне і салідарнасць паміж народамі. Неацэнную дапамогу аказваў і працягвае аказваць Фонд міру народам гераічнага В'етнама, Анголы, Эфіопіі, патрыётам Чылі, Нікарагуа, Уругвая, Парагвая, абяздоленаму, пазбаўленаму радзімы народу Палясціны, барацьбітам Поўдня Афрыкі.

Сродкі Фонду ўтвараюцца з грашовых узносаў, розных дароў савецкіх і замежных арганізацый і грамадзян, ад аўтарскіх ганарараў, узнагарод за вынаходніцтвы, ад спецыяльна арганізаваных спектакляў, канцэртаў, вечароў, лекцый, спартыўных выступленняў і г. д. Добрай традыцыяй сталі «вахты міру», якія праводзяцца калектывамі многіх прадпрыемстваў краіны, сельскімі працаўнікамі. Многія рабочыя брыгады і будаўнічыя атрады залічваюць у свой састаў ганаровымі байцамі герояў, якія загінулі за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы, а таксама касманаўтаў. Грошы, запрацаваныя на іх імя, пералічваюцца ў Фонд міру.

Калектыву нашага універсітэта, як і ўсім савецкім людзям, дарагі мір на зямлі. Усе мы гнеўна асуджаем агрэсараў, расістаў, фашысцкіх дыктатараў. Сваімі грашовымі ўзносамі мы аказваем падтрымку патрыётам, якія змагаюцца за свае правы, свабоду і незалежнасць. Амаль кожны супрацоўнік ГДУ пералічыў у бягучым годзе два працэнты сваёй месячнай заработнай платы, значныя сродкі былі сабраны і студэнтамі. Усяго калектывам універсітэта сёлета пералічана ў Фонд міру звыш пяці тысяч рублёў.

Па традыцыі ў пачатку кожнага года праводзіцца масавы збор сродкаў у Фонд міру. Не будзе выключэннем і надыходзячы 1979 год. Універсітэцкая камісія садзейнічання Фонду міру заклікае ўсіх унесці ў яго свой пасільны ўзнос.

**І. СТАРУН,**
**старшыня універсітэцкай камісіі садзейнічання савецкаму Фонду міру, загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі.**

*Канцэрты шэфаў*

# ЛЁГКА НА СЭРЦЫ АД ПЕСНІ ВЯСЁЛАЙ...

...І зноў агітбрыгада гісторыка-філалагічнага факультэта ў дарозе. У аўтобусе — жарты, смех, разліваюцца гукі баяна, гітары, гучаць песні. На нейкі момант песня абрываецца, і наш канферанс'е складае праграму для наступных канцэртаў. А іх наперадзе ў агітбрыгады нямала. Не ўпершыню мы едзем у падшэфны Рагачоўскі раён. Тут, за два дні, мы далі дзевяць канцэртаў. Нас віталі навучэнцы прафтэхвучылішчаў, вучні агульнаадукацыйных і спартыўных школ г. Рагачова. Мы выступалі не толькі з канцэртнай праграмай, але і расказвалі гледачам пра наш універсітэт, горад над Сожам.

Па традыцыі канцэрт агітбрыгады адкрывае Міхаіл Космыкаў. Ён чытае верш Р. Раждзественскага «Канцэрт».

Цёпла і сардэчна, гарачымі апладысментамі сустракалі нас жыхары многіх вёсак. Лепшым працаўнікам калгасаў мы прысвячалі нумары нашай праграмы.

Спачатку мы адчуваем сябе некалькі няёмка, але радасны настрой гледачоў хутка перадаецца і нам. Мы спяваем, чытаем вершы, паказваем гумарыстычныя сцэнкі са студэнцкага жыцця. Але яшчэ весялей становіцца, калі пачынаюць сваё выступленне нашы танцоры Уладзімір Сядзько і лаўрэат рэспубліканскага конкурсу Наталля Курбан. Лёгкія, адточаныя рухі, нацыянальныя касцюмы, цудоўныя мелодыі рускага, украінскага, малдаўскага танцаў не пакінулі гледачоў абыякавымі.

Але вось у зале ўсталёўваецца цішыня. Пра светлае пачуццё чалавека — каханне — гавораць вершамі вядомых паэтаў нашы чытальнікі Алена Няменка і Вячаслаў Капытка.

Затым пад акампанемент гітары спявае Валянціна Лукашэвіч. Не хочуць адпускаць са сцэны і Галіну Казак, якая з дзіцячай непасрэднасцю выканала гумарыстычныя «Дзянісkіны расказы».

І так дзевяць разоў. Канешне, нялёгка даводзіцца, але куды толькі знікае стомленасць, калі зноў загучаць любімыя мелодыі, калі побач сябры!

Позна вечарам вяртаемся дамоў. Але развітвацца не хочацца. У нас столькі ўражанняў! А наперадзе — новыя паездкі, канцэрты, сустрэчы з гледачамі.

**Н. ПРОХАРАВА,**
**студэнтка групы Б-31 гісторыка-філалагічнага факультэта, удзельніца агітбрыгады.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Рэктарат, партком, мясцком, дэканат і студэнты фізічнага факультэта, калектыў кафедры палітэканоміі выказваюць глыбокае спачуванне выкладчыку кафедры палітэканоміі ОКРУТУ Анатолю Іванавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.**

АЗ 50607 « Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друж. аркуш.
Наш адрас: вул. Кірава 119, корпус № 2, П 4-8, т 3-27-71. Фармат 600×420 мм. Тыраж 2000 экз
Заказ 6448